# ВЯЛІКІЯ ЗАДАЧЫ, ЯКІЯ ТРЭБА ВЫРАШЫЦЬ РАЗАМ

## Беларусь і Кітай паглыбляюць супрацоўніцтва ў праваахоўнай сферы

**Звычайна ўзровень стратэгічнага супрацоўніцтва паміж дзяржавамі лічыцца самым высокім: партнёры не проста давяраюць адно аднаму і актыўна нарошчваюць тавараабарот, але і рэалізуюць шэраг сумесных праектаў у розных сферах, рэалізуюць сумесныя ініцыятывы на міжнароднай арэне... Беларусь і Кітай ужо пераадолелі гэтую прыступку, і з мінулага года наша супрацоўніцтва носіць яшчэ больш цесны характар — давернага ўсебаковага стратэгічнага партнёрства і ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва. А ў любых краін-партнёраў амаль заўсёды на першых пазіцыях у парадку супрацоўніцтва знаходзяцца дзве тэмы: эканоміка і бяспека.**

Учора Прэзідэнт Беларусі правёў дзве сустрэчы з прадстаўнікамі Кітайскай Народнай Рэспублікі — з членам Дзяржсавета КНР, міністрам грамадскай бяспекі Го Шэнкунем і з членам Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі і Генеральным пракурорам Вярхоўнай народнай пракуратуры КНР Цаа Цзяньмінам. З улікам нядаўніх падзей у рэгіёне супрацоўніцтва ў праваахоўнай сферы становіцца актуальным як ніколі. Беларусі і Кітаю ёсць чаму павучыцца адно ў аднаго.

— Ваш прыезд знакавы, — падкрэсліў Прэзідэнт, вітаючы міністра грамадскай бяспекі КНР. — Здавалася б, і адлегласць вялікая паміж нашымі дзяржавамі, і ў былыя часы сказалі б: ну якія могуць быць агульныя пытанні ў сферы праваахоўнай дзейнасці? Нічога падобнага, часы змяніліся. Свет стаў вельмі цесным, злачыннасць — інтэрнацыянальнай. Таму перад намі вельмі вялікія задачы, якія мы павінны рашаць разам.

Мы ўжо даволі грунтоўна супрацоўнічаем. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ідзе сур'ёзны ператок людзей: беларусы едуць у Кітай, грамадзяне Кітая — у Беларусь.

— Мы вельмі шмат будуем сумесных прадпрыемстваў у Кітаі, і асабліва тут, у Беларусі працуе вельмі шмат грамадзян з Кітая. Натуральна, з усімі станоўчымі і негатыўнымі тэндэнцыямі ў нашых краінах ідзе ператок праблем. Таму ўзнікае неабходнасць больш актыўнай, цеснай работы праваахоўных ведамстваў.

Асабліва нашу дзяржаву цікавіць вопыт Кітая ў арганізацыі і правядзенні Алімпійскіх гульняў у 2008 годзе. Зусім хутка ў нашай краіне таксама пройдзе вельмі масавае спартыўнае мерапрыемства — II Еўрапейскія гульні:

— Ваш вопыт для нас будзе вельмі важным. Мы вялікую ўвагу асабліва зараз удзяляем новым выклікам, якія з'явіліся, і некаторым старым праблемам, якія абвастрыліся, такім як экстрэмізм, тэрарызм, сепаратызм. Гэта тыя тры біды, супраць якіх Кітайская Народная Рэспубліка вядзе актыўную барацьбу. Кіберзлачыннасць, актыўная міграцыя... Па гэтых кірунках нам яшчэ трэба будзе выпрацаваць сур'ёзныя мерапрыемствы для актыўнага супрацоўніцтва. Словам, праблем нямала, таму і работы для праваахоўнікаў двух нашых краін будзе таксама вельмі многа. Мы да гэтага гатовы, спадар міністр.

Го Шэнкунь падзякаваў за магчымасць сустрэцца і перадаў прывітанне і найлепшыя пажаданні ад Старшыні КНР Сі Цзіньпіна.

Падчас сустрэчы з Генеральным пракурорам Вярхоўнай народнай пракуратуры КНР Прэзідэнт канстатаваў:

— У нас устанавіліся вельмі цесныя адносіны не толькі з кіраўніцтвам вашай дзяржавы, Старшынёй Кітайскай Народнай Рэспублікі, але і вельмі добрыя адносіны на міжведамасным узроўні. Гэта датычыцца і супрацоўніцтва нашых генеральных пракурораў. Як мне пракурор дакладвае, у нашых пракуратур вельмі добрыя адносіны. А калі ўлічваць у прынцыпе аднатыпныя пазіцыі, аднатыпныя задачы, якія вырашае пракуратура ў нас і ў вас, для нас набывае вельмі важнае значэнне супрацоўніцтва з вамі, паколькі вы валодаеце вельмі багатым і рознабаковым вопытам. У вас каласальны вопыт назапашаны.

З узнікненнем новых відаў злачыннасці, новых выклікаў бяспецы пракуратурам важна падтрымліваць кантакты.

— Арганізаваная злачыннасць і карупцыя носяць больш дасканалыя формы, муціруюць, калі можна так сказаць, гэтыя з'явы, а генеральныя пракуроры, пракуратура ў вас і ў нас з'яўляюцца органамі, якія каардынуюць дзейнасць праваахоўных органаў па ўсіх кірунках — у тым ліку і па названых. Таму мы збіраемся актывізаваць наша супрацоўніцтва па кірунках барацьбы са злачыннасцю, каардынацыі гэтых дзеянняў. Думаю, што для Кітайскай Народнай Рэспублікі гэта таксама будзе неабходна і карысна.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Парламенцкі дзённік

# ПАКІСТАНСКІЯ ПЕРСПЕКТЫВЫ

**Беларуская дэлегацыя на чале са спікерам Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Уладзімірам АНДРЭЙЧАНКАМ з афіцыйным візітам знаходзіцца ў Пакістане. Акрамя парламентарыяў, у Ісламабад накіраваліся прадстаўнікі дзяржорганаў і дзелавых колаў.**

Як паведамляе прэс-служба ніжняй палаты, учора адбылася сустрэча Уладзіміра Андрэйчанкі са спікерам Нацыянальнай асамблеі парламента Пакістана Сардарам Аязам Садзікам.

Пакістанскі спікер падкрэсліў, што яго краіна надае выключна вялікае значэнне візіту беларусаў. Падчас перагавораў было абмеркавана шырокае кола пытанняў двухбаковага парадку, якія датычацца ўмацавання гандлёва-эканамічных сувязяў і развіцця дзелавых кантактаў з улікам дамоўленасці Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі і прэм'ер-міністра Пакістана Наваза Шарыфа давесці да 2020 года аб'ём узаемнага тавараабароту да аднаго мільярда долараў ЗША.

«Уладзімір Андрэйчанка і Сардар Садзік выказалі ўзаемнае разуменне таго, што развіццё поўнафарматнага ўзаемадзеяння Беларусі і Пакістана немагчымае без усталявання і нарошчвання эфектыўнага міжпарламенцкага дыялогу, — інфармуе прэс-служба Палаты прадстаўнікоў. — Абодва бакі выказалі зацікаўленасць у падтрымцы супрацоўніцтва ў галіне аграпрамысловага комплексу. У гэтым плане падкрэслена значнасць правядзення 11 красавіка бягучага года ў Ісламабадзе першага Беларуска-Пакістанскага сельскагаспадарчага форуму».

У гэты ж дзень прайшла сустрэча Уладзіміра Андрэйчанкі з міністрам нацыянальнай харчовай бяспекі і даследаванняў Пакістана Хасанам Басанам.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.** *yushkevich@zviazda.by*

■ Акцэнты тыдня

# СВЕТУ НЕАБХОДНА ЗГУРТАВАННЕ



**Атака на Сірыю з боку ўзброеных сіл ЗША** ў ноч на 7 красавіка стала самай шакіруючай навіной тыдня. Яе прычыну цяжка назваць рацыянальнай. Паводле абвешчанай версіі Вашынгтона, армія Прэзідэнта Асада нібыта не знайшла нічога лепшага, як выкарыстаць забароненую хімічную зброю для атакі грамадзянскіх асоб у сірыйскай правінцыі Ідліб. З пункту гледжання цвярозага сэнсу гэта абвінавачанне не вытрымлівае ніякай крытыкі. Выкарыстанне хімічнай зброі ў Сірыі, што прыпісваецца ўраду, ужо аднойчы выклікала пагрозу атакі ЗША ў 2013 годзе, пасля чаго былі прыняты захады да вывазу і знішчэння ўсіх старых арсеналаў з тэрыторыі, якая кантралюецца сірыйскім урадам, за мяжу для знішчэння. Сітуацыя ўнутры Сірыі з тых часоў вельмі рэзка змянілася на карысць Асада. Пры падтрымцы Расіі і Ірана вызвалена значная частка тэрыторыі краіны, Ісламская дзяржава вельмі аслаблена ўдарамі Расіі і заходняй кааліцыі як на тэрыторыі Сірыі, так і Ірака. ЗША ўпершыню з 2011 года заявілі пра тое, што не вядуць барацьбу супраць Асада, і магчымыя сцэнарыі, пры якіх ён можа застацца пры ўладзе. Выкарыстоўваць у такой сітуацыі хімічную зброю мог бы толькі вар'ят. Дзве рэальныя версіі здарэння простыя. Альбо хімічная зброя была выкарыстана паўстанцамі, каб прымусіць ЗША ўмяшацца ў канфлікт на іх баку, альбо сітуацыя была арганізавана адным з саюзнікаў ЗША, каб ператварыць барацьбу супраць Ісламскай дзяржавы ў барацьбу супраць Асада.

Яшчэ адной негатыўнай навіной тыдня стала **абмеркаванне вядучымі заходнімі краінамі новых санкцый супраць Расіі за падтрымку Асада**, які нібыта выкарыстаў хімічную зброю. Пра гэта заявіла ў нядзелю пастаянны прадстаўнік Злучаных Штатаў пры ААН Нікей Хейлі. Таксама газета The Times паведаміла, што брытанскі міністр замежных спраў Борыс Джонсан будзе патрабаваць на пасяджэнні кіраўнікоў МЗС G7, якое пройдзе ў Італіі, вельмі жорсткіх санкцый супраць Расіі як пакаранне за хімічную атаку на кантраляваныя паўстанцамі тэрыторыі. Магчымае далейшае ўзмацненне жорсткасці санкцый супраць Расіі з'яўляецца дрэннай навіной. Расія і так значна страціла з прычыны ўжо ўведзеных санкцый і спадарожных мер, і новыя санкцыі могуць толькі павялічыць рашучасць выкарыстоўваць усе магчымыя меры для змены сітуацыі, але не ісці на повадзе ў Захаду.

Яшчэ адной навінай, якая не можа не павялічыць занепакоенасць ростам геапалітычнага напружання ў свеце, з'яўляецца **рашэнне адправіць ударную групу Ваенна-марскіх сіл ЗША ў раён Карэйскага паўвострава**. Група караблёў на чале з атамным авіяносцам Carl Vinson накіравалася ў рэгіён з Сінгапура. Афіцыйная прычына — занепакоенасць ЗША адносна нарошчвання КНДР ваеннага патэнцыялу. На фоне ракетнага ўдару па Сірыі ў многіх экспертаў узніклі падазрэнні, што прычына іншая. Ёсць рызыка, што задачай ударнай групоўкі разам з ужо назапашаным ваенным патэнцыялам ЗША ў рэгіёне на тэрыторыі Паўднёвай Карэі і Японіі з'яўляецца атака на Паўночную Карэю. Улічваючы той факт, што ў КНДР назапашаны пэўны ядзерны патэнцыял, пры такім сцэнарыі магчымы варыянт першага ў свеце выкарыстання ядзернай зброі пасля 1945 года. Яна можа быць выкарыстана ў першай атацы ЗША на Паўночную Карэю, каб нанесці знішчальны ўдар, улічваючы дастаткова простыя адносіны новага амерыканскага лідара да ядзернай зброі (калі яна ёсць, то яе можна выкарыстоўваць), ці Паўночнай Карэяй пасля атакі ЗША звычайнымі сродкамі.

На фоне гэтых навін **два сур'ёзныя тэрарыстычныя акты** — у метро Санкт-Пецярбурга і ў Стакгольме — не змаглі аб'яднаць Еўропу, прымусіўшы забыцца пра менш важныя рэчы на фоне агульнай праблемы з тэрарызмам. Падчас выбуху ў метро загінула 14 чалавек, дзясяткі былі паранены. Тэракт у Стакгольме прайшоў па жахлівым сцэнарыі, які стаў ужо звыклым, калі грузавік выкарыстоўваецца для таго, каб забіваць мірных пешаходаў, у выніку чаго загінула 4 чалавекі. Між тым пры розных сцэнарыях ёсць аб чым задумацца. Абодва яны магчыма былі ўчынены выхадцамі з краін Цэнтральнай Азіі, у Санкт-Пецярбургу метро, як мяркуецца, падрываў выхадзец з Кыргызстана, у Стакгольме людзей душыў, магчыма, выхадзец з Узбекістана. Свету варта было б звярнуць пільную ўвагу на тое, наколькі эфектыўна радыкалы ажыццяўляюць сваю падрыўную работу на тэрыторыі Цэнтральнай Азіі, і паставіць перашкоды на іх шляху. Але для гэтага неабходна згуртаванне вядучых палітычных сіл, на што былі надзеі, калі Трамп, ідучы на выбары, дэкляраваў сваю будучую знешнепалітычную праграму дзеянняў, ад якой пасля выбараў з лёгкасцю адмовіўся.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук**

■ З нагоды

# НАДЗЕЙНАЯ АПОРА ДЗЯРЖАВЫ

## Воіны-інтэрнацыяналісты па-ранейшаму будуць адстойваць нацыянальныя інтарэсы

**Больш як 300 дэлегатаў з усёй краіны сабралася днямі падчас IX з'езда Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане. Падвёўшы вынікі сваёй дзейнасці за папярэдні перыяд, воіны-інтэрнацыяналісты абмеркавалі надзённыя праблемы і вызначыліся з планамі на наступную пяцігодку.**

— Наша арганізацыя запатрабавана часам і грамадствам, — перакананы **старшыня Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане генерал-маёр запасу Валерый ГАЙДУКЕВІЧ**. — Мэты і задачы Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане супадаюць з праграмай «За моцную і квітнеючую Беларусь». Мы за такую дзяржаву, у якой сацыяльна абаронены ўсе грамадзяне, дзе павагай карыстаюцца ветэраны. Мы, воіны-інтэрнацыяналісты, былі і будзем надзейнай апорай дзяржавы, адстойваючы нацыянальныя інтарэсы краіны, захоўваючы яе цэласнасць і незалежнасць.

Адной з прыярытэтных задач грамадскага аб'яднання па-ранейшаму застаецца патрыятычнае выхаванне падрастаючага пакалення. «Хто, калі не мы, не толькі асабістымі прыкладамі, а і справамі будзе вучыць моладзь адносінам да жыцця, свайму месцу ў грамадстве, вучыць дабрыні і любові да сваёй Радзімы, гатоўнасці адстойваць тэрытарыяльную цэласнасць краіны?» — падкрэсліў старшыня Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане.

Не новая для грамадскага аб'яднання і такая задача, як дапамога тым, хто мае ў гэтым патрэбу. Як адзначылі на з'ездзе, большасць воінаў-афганцаў — самадастатковыя людзі, але ёсць тыя, каму трэба дапамагчы. У першую чаргу гэта датычацца пытанняў пенсійнага забеспячэння ветэранаў баявых дзеянняў з ліку салдат і сяржантаў тэрміновай службы, асабліва інвалідаў, якія не мелі працоўнага стажу да прызыву. Закраналіся падчас з'езда і пытанні медыцынскага абслугоўвання інвалідаў, клопату аб бацьках і ўдовах загінулых у Афганістане.

Па словах **старшыні савета Мінскай гарадской арганізацыі ветэранаў вайны ў Афганістане «Памяць» Уладзіміра ШОКАВА**, сёння ідзе работа над удасканаленнем закона «Аб ветэранах», які будзе прыняты ў новай рэдакцыі. «Прайшло 25 гадоў з моманту прыняцця закона, многія яго артыкулы ўжо неактуальныя, — гаворыць старшыня гарадской арганізацыі. — Напрыклад, прадугледжана павышэнне статусу ўдзельнікаў баявых дзеянняў, у тым ліку інвалідаў».

— Акрамя таго, што з'езд дае магчымасць падвесці вынікі работы афганскіх арганізацый, абмеркаваць актуальныя пытанні, гэта яшчэ і радасная сустрэча сяброў, — лічыць **дырэктар дабрачыннага фонду дапамогі воінам-інтэрнацыяналістам «Памяць Афгана» Аляксандр МЯТЛА**. — У той жа час нельга сказаць, што мы не маем зносін на працягу пяці гадоў. Ёсць пытанні — мы збіраемся і вырашаем іх. Наш фонд увогуле працуе з людзьмі індывідуальна.

Дарэчы, упершыню на з'ездзе ветэранаў вайны ў Афганістане прысутнічалі дзеці тых, хто дамоў з той вайны не вярнуўся. Бацька Андрэя Млявага загінуў у Афганістане ў 1985 годзе. Амаль за тры месяцы лётчык-верталётчык здзейсніў 117 баявых вылетаў, быў узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і Чырвонага Сцяга. Пасмяротна. Сын воіна-інтэрнацыяналіста, які ў 12 гадоў застаўся без бацькі, як ніхто ведае цану міру, таму на канкрэтным прыкладзе вучыць сваіх дачок любіць Радзіму.

У канцы з'езда дэлегаты выбралі новы савет Беларускага саюза ветэранаў вайны ў Афганістане. Па выніках галасавання, старшынёй грамадскага аб'яднання застаўся Валерый Гайдукевіч. Для яго, воіна-інтэрнацыяналіста, не чужыя праблемы ветэранаў вайны ў Афганістане, і як вопытны кіраўнік, ён ведае, як іх вырашаць.

**Вераніка КАНЮТА.** *kanyuta@zviazda.by*

# Вайна адабрала ў іх дзяцінства

Сёння ў Магілёве зноў будуць успамінаць малалетніх вязняў фашысцкіх лагераў. Да помніка «Дзецям вайны» ў Магілёве лягуць кветкі, а людзі на хвіліну замруць у маўчанні, каб аддаць даніну памяці нявінным ахвярам Вялікай Айчыннай вайны. Па традыцыі ў мітынгу прымаюць удзел прадстаўнікі ўлады, грамадскіх арганізацый, сведкі тых жахлівых падзей, ветэраны вайны, моладзь.

Па словах **старшыні Магілёўскай абласной асацыяцыі малалетніх вязняў фашысцкай няволі Уладзіміра ПАРАХНЕВІЧА**, сёння ў абласным цэнтры пражывае каля 640 малалетніх вязняў. Гэта тыя, хто нарадзіўся ў перыяд з 1927 па 1945 год. На тэрыторыі Магілёўскай вобласці ў гады вайны дзейнічала 130 лагераў, гета і іншых месцаў прымусовага ўтрымання людзей. У іх было знішчана каля 152 тысяч чалавек. Самай жахлівай фабрыкай смерці ў Магілёве быў Лупалаўскі канцлагер (шталаг №341), дзе з 1941 па 1943 год было закатавана звыш 40 тысяч чалавек. Сёння вядомы імёны толькі некалькіх сотняў з іх.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*